СТО ГАДОЎ МАЛАДОЙ «АЛЕСІ» 8

ЁН СТВАРЫЎ «МІКОЛКУ-ПАРАВОЗА» 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 ЛІСТАПАДА 2024 г. СУБОТА № 234 (30368)

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Андрэй КАРОЛЬ, рэктар Белдзяржуніверсітэта:**

*«Далучэнне маладога пакалення да адзінай гістарычнай памяці выступае адной з першачарговых задач дзяржавы. Моладзь павінна ведаць і шанаваць першаасновы, закладзеныя ў кодзе ўсёй нацыі. Цяпер назіраецца сапраўдная барацьба за мінулае, сацыяльныя карані і гістарычную памяць беларускага народа. У гэтым кантэксце маладым людзям важна адчуваць згуртаванасць і адзінства, а таксама разумець адказнасць за прынятыя лёсавызначальныя для грамадства і краіны рашэнні. Асабліва актуальна гэта падчас важнай падзеі — выбараў Прэзідэнта Беларусі».*

## КАРАТКА

- **Створана Аб'яднаная арганізацыя суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці БСЖ.**
- Раман Галоўчанка: вытворчасць індычкі з 2021 года вырасла больш як у тры разы.
- **Стратэгічную сесію па развіцці супрацоўніцтва ў СНД плануецца правесці ў Мінску ў чэрвені 2025 года.**
- «Атлант-М» адкрыў новы дылерскі цэнтр BELGEE.
- **Кітай пачаў купляць на БУТБ беларускае масла.**
- Тэрміновыя дэпазіты фізічных асоб у беларускіх рублях на пачатак лістапада дасягнулі Br10,4 млрд.
- **МТК «Сянькова» на 600 галоў дойнага статка адкрыўся ў Магілёўскім раёне.**

# УЛАДАР МЛЫНОЎ

**Арцём ДАКУНАЎ працуе на Беларускім цэментным заводзе... млынаром. Дакладней, машыністам млыноў цэха памолу. Тут вырабляюць сыравінную муку, а махіна за спінай у Арцёма — гэта і ёсць той самы «млын». Падтрыманне млыноў у рабочым стане, кіраванне імі — яго непасрэдны абавязак.**

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

Май на ўвазе

# Паспейце «пераабуць» колы

**Згодна з правіламі дарожнага руху, з 1 снежня да 1 сакавіка ўсе транспартныя сродкі пры ўдзеле ў дарожным руху павінны быць абсталяваны зімовымі шынамі катэгорый М1 і N1. Яны павінны ўстанаўлівацца на ўсе колы транспартнага сродку і мець адпаведную маркіроўку. Калі выкарыстоўваюцца шыпаваныя шыны, яны таксама павінны быць устаноўлены на ўсіх колах аўтамабіля.**

Многія кіроўцы выкарыстоўваюць усесезонную гуму або працягваюць ездзіць на летняй. **Ганна БАНАДЫК, часова выконваючая абавязкі начальніка аддзялення арганізацыі міжведамаснага ўзаемадзеяння і прапаганды бяспекі дарожнага руху галоўнага ўпраўлення ДАІ МУС**, звярнула ўвагу, што летняя гума нават на сухой дарозе не выконвае ўсе свае функцыі, а пры мінусавай тэмпературы дубее і перастае трымаць кантакт з дарогай.

Заўтра Дзяржаўтаінспекцыя пачне кантраляваць падрыхтоўку транспартных сродкаў да зімовай эксплуатацыі. Асаблівая ўвага — абсталяванню аўтамабіляў зімовымі шынамі. Таксама будзе ажыццяўляцца кантроль за спраўнасцю колаў і шын.

За ўдзел у дарожным руху транспартных сродкаў, якія не абсталяваны зімовымі шынамі, а таксама маюць няспраўнасці колаў і шын, прадугледжана адказнасць — штраф да адной базавай велічыні. Паўторнае такое парушэнне на працягу года прывядзе да штрафу ў памеры ад дзвюх да пяці базавых велічынь.

**Алена КРАВЕЦ.**

Соцыум

# У ЗОНЕ ДОСТУПУ

## Як змяняецца гарадское асяроддзе

**Больш як 300 мільёнаў рублёў у наступнай пяцігодцы плануецца выдаткаваць на стварэнне даступнага асяроддзя для людзей з інваліднасцю. Аб'екты сацыяльнай інфраструктуры, жыллёвага фонду, вуліц, вакзалаў паступова абсталёўваюцца пандусамі, пад'ёмнікамі, поручнямі, тактыльнымі і візуальнымі паказальнікамі, маўленчымі інфарматарамі і іншымі элементамі безбар'ернага асяроддзя. Як мяняецца гарадская інфраструктура і што яшчэ плануецца зрабіць у найбліжэйшы час, расказалі спецыялісты.**

### ДАРОЖНАЯ КАРТА

Галоўная мэта дзяржавы сёння — інтэграваць чалавека з інваліднасцю ў грамадства. І тут немалаважным з'яўляецца стварэнне даступнага асяроддзя. Работа па яго забеспячэнні з'яўляецца карпатлівым і працаёмкім працэсам, які патрабуе значных фінансавых укладанняў і часавых затрат. Гэта дзейнасць ажыццяўляецца ў рамках Дзяржаўнай праграмы «Сацыяльная абарона» на 2021—2025 гады.

— На старце праграмы ў 2020 годзе поўнасцю даступнымі былі 22 тысячы аб'ектаў, што складае 17 працэнтаў, — адзначыла **начальнік упраўлення па справах інвалідаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Вікторыя ГРАЧЫХА.** — Гэта сацыяльныя аб'екты, такія як магазіны, школы, аптэкі і паліклінікі. На працягу пяцігодкі мы плануем забяспечыць даступнасць яшчэ каля васьмі тысяч аб'ектаў, давёўшы іх агульную колькасць да 30,5 тысячы. На сённяшні дзень ужо 28 тысяч аб'ектаў з'яўляюцца цалкам даступнымі, што складае прыкладна 22 %. На мэты гэтай дзяржаўнай праграмы на бягучую пяцігодку запланавана больш як 300 мільёнаў рублёў.

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Ідзе падпіска на I квартал і I паўгоддзе 2025 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2025 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.

# Пагутарыць са сваім дэпутатам

**Ігар СЕРГЯЕНКА правёў асабісты прыём у Шаркаўшчыне**

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў, дэпутат ад Пастаўскай выбарчай акругі № 29 Ігар Сергяенка з рабочым візітам наведаў Шаркаўшчынскі раён. На парадку дня былі асабісты прыём грамадзян у райвыканкаме і сустрэча з працоўнымі калектывамі дарожных арганізацый раёна.**

Звярнуцца да Старшыні Палаты прадстаўнікоў з асабістымі праблемамі грамадзяне змаглі ў Шаркаўшчынскім райвыканкаме. Пенсіянерка паскардзілася на веласіпедыстаў, якія рухаюцца ў гарпасёлку па адным тратуары з пешаходамі. Старшыня райвыканкама Дзмітрый Ламака растлумачыў, што ў бягучым годзе пачаліся работы па добраўпарадкаванні тратуараў для двухкалёснага віду транспарту, а ў 2025 годзе ў гарпасёлку плануюць рэалізаваць праект па паляпшэнні вулічна-дарожнай сеткі і стварэнні камфортных умоў для аматараў веласіпедных прагулак.

Яшчэ адна заяўніца папрасіла дапамогі ў пытанні раздзелу маёмасці ў сувязі са скасаваннем шлюбу. Былы муж таксама прысутнічаў на прыёме. Яму растлумачылі парадак раздзелу агульнай маёмасці і падкрэслілі, што ў найбліжэйшы час будзе праведзена праверка на прадмет мэтавага выкарыстання сродкаў ільготнага крэдыту на будаўніцтва і рэканструкцыю жылога дома.

Было ўзнята пытанне налічэння пенсіі. Так, жанчына з Браслаўскага раёна 23 гады адпрацавала ў Беларусі, а 12 — у Латвіі, цяпер заяўніца не згодна з памерам налічанай пенсіі і просіць яе перагледзець. Прадстаўнік упраўлення па сацыяльнай абароне Браслаўскага райвыканкама адзначыў, што пенсія налічана правільна ў адпаведнасці з дзеючым беларускім заканадаўствам.

Мужчына з Дрыбінскага раёна Магілёўшчыны папрасіў дапамогі ў набыцці невыкарыстоўвальнай маёмасці ў Глыбоцкім раёне з мэтай вядзення бізнесу. Пенсіянер з Верхнядзвінскага раёна звярнуўся да Ігара Пятровіча ад імя дачкі, што пражывае ў Дзяржынскім раёне Мінскай вобласці. Жанчына доўгі час змагаецца з будаўнічай арганізацыяй, якая неналежным чынам выканала паслугі па будаўніцтве жылога дома.

Уласнік сялянска-фермерскай гаспадаркі з Докшыцкага раёна папрасіў садзейнічання ў вырашэнні пытання разліку за транспартныя паслугі, якія ён аказаў аднаму з сельскагаспадарчых прадпрыемстваў суседняга раёна. У райвыканкаме запэўнілі, што ўжо складзены графік выплат, па якім сельгаспрадпрыемства павінна выплаціць доўг за тры месяцы.

Не абышлося і без нараканняў на стан дарожнай сеткі. Заяўніца з Шаркаўшчыны расказала, што паміж вёскамі Савуткі Шаркаўшчынскага раёна і Мосар Глыбоцкага раёна вясковая дарога амаль непрыязная, асабліва — з наступленнем дажджоў. Прадстаўнік Глыбоцкага райвыканкама згадзіўся з праблемай і падкрэсліў, што на ўчастку гэтай дарогі, якая разбіваецца вялікагрузнай тэхнікай, будзе часцей праводзіцца прафіляванне і грэйдзіраванне.

Жыхарку Шаркаўшчыны цікавіла пытанне захавання працоўных адносін з наймальнікам. Яшчэ адна жанчына папрасіла дапамогі ў афармленні догляду дачкі з інваліднасцю. Галоўны ўрач мясцовай цэнтральнай раённай бальніцы дэтальна растлумачыла алгарытм афармлення.

* * *

Падводзячы вынікі асабістага прыёму грамадзян, Ігар Сергяенка адзначыў, што звярталіся людзі не толькі з Шаркаўшчынскага раёна, але і з найбліжэйшых рэгіёнаў, іншых абласцей. «Кожны чалавек прыходзіць са сваёй праблемай. Трэба ўважліва выслухаць і зразумець сутнасць пытання. Калі праблема вырашальная — трэба давесці яе да лагічнага канца. Калі пытанне нельга вырашыць у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, трэба патлумачыць прычыну. Але тут не павінна быць ніякай кампанейшчыны — усе пытанні павінны разглядацца па меры іх паступлення і ва ўзаемадзеянні з мясцовай уладай. З людзьмі трэба размаўляць — тады яны будуць даверяць уладзе», — падкрэсліў Старшыня Палаты прадстаўнікоў і дадаў, што ўсе звароты ўзяты на кантроль.

У гэты ж дзень Ігар Сергяенка сустрэўся з працоўнымі калектывамі дарожных арганізацый Шаркаўшчынскага раёна. Падчас адкрытага дыялогу былі ўзняты пытанні развіцця сельскай мясцовасці, стварэння камфортных умоў для замацавання спецыялістаў, нацыянальнай бяспекі і будучых выбараў Прэзідэнта Беларусі. Таксама Старшыня Палаты прадстаўнікоў разам з кіраўніцтвам раёна наведаў будаўнічую пляцоўку шматпрофільнага харчовага перапрацоўчага прадпрыемства, дзе ў хуткім часе будуць выпускаць сокі і нектары ў рамках інвестпраграмы «Адзін раён — адзін праект».

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота газеты «Кліч Радзімы».**

# Ацяпленне, рамонт дарог і агульнае добраўпарадкаванне

## З якімі пытаннямі прыходзілі да кіраўніка Міншчыны ў Мядзеле

**Старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН правёў асабісты прыём грамадзян у Мядзеле. Хоць раён лічыцца адным з самых паспяховых, праблемы ёсць і тут. Карэспандэнт «Звязды» прысутнічаў на прыёме і разам з адказнымі асобамі пастараўся разабрацца ў пытаннях, якія хвалююць жыхароў рэгіёна.**

### Атрымаць цяпло ад разеткі

Жыхароў вёскі Раманаўшчына хвалюе пытанне электразабеспячэння жылых дамоў для ацяплення і гарачага водазабеспячэння. «Дапамажыце, калі ласка, правесці ў нашы дамы электраэнергію, — звярнулася жыхарка вёскі Ала Аляксандраўна. — Мы з 2019 года просім, каб нам далі дазвол на электраацяпленне, але ў выніку атрымаў яго толькі адзін чалавек. Нам, праўда, таксама паабяцалі, што да 2025 года мы зможам перавесці свае дамы на электраацяпленне. Мы чакалі, але бачым, што толку ніякага...» Па словах заяўніцы, у вёску выязджаў прадстаўнік Маладзечанскіх электрасетак: «Ён сказаў, што трэба выкупляць зямлю пад трансфарматары, паказаў, дзе слупы ставіць. Пасля гэтага візіту прыехаў наш старшыня райвыканкама Аляксандр Прановіч, зноў былі супрацоўнікі электрасетак. Ён паабяцаў, што ў 2025-м пачнуцца работы па рэканструкцыі электрасетак, і ў 2026 годзе мы зможам перайсці на электраацяпленне. Мы пагадзіліся на такі варыянт, але пісьмовага адказу так і не атрымалі».

**Генеральны дырэктар «Мінскэнерга» Павел ГАРУДКА** расказаў, што сеткі ў Раманаўшчыне зношаныя, яны 1994 года пабудовы: «На наступны год уключым сеткі ў план перадпраектных работ, будзем займацца праектам. Але яго рэалізацыя зойме тры гады, гэта значыць, не раней 2027-га...»

«Тры гады — гэта максімальны тэрмін», — падкрэсліў Аляксандр Турчын. Ён таксама параіў заяўніку пакуль што звярнуць увагу на такі эфектыўны і танны від паліва, як пелеты.

### Плот перашкаджае спадчыне

Жыхарка сталіцы Людміла Казіміраўна прыйшла на прыём да кіраўніка вобласці з праблемай афармлення спадчыны і дзяльбы зямлі. Вось ужо сем гадоў яна не можа аформіць спадчыну ў вёсцы Свір Мядзельскага раёна, якую атрымала ад маці. «Калі пачала афармляць дом, былі праблемы з дакументамі. Іх дасылалі не па тым адрасе, яны губляліся: увогуле, на нейкі час пакінула гэтую справу. Потым зноў пачала афармляць дом — усё скончылася добра. Але зямля па-ранейшаму пад пытаннем. А ўсё праз тое, што я заняла 0,003 гектара забалочанага ўчастка і паставіла плот, — падзялілася Людміла Казіміраўна. — Спадзявалася, што ўсё атрымаецца спакойна ўладзіць, бо ёсць «зямельная амністыя», якая дазваляе ўзаконіць занятыя землі, калі яны не падыходзяць пад сельгасугоддзі. Аднак мне такой магчымасці не далі: сказалі, трэба яшчэ даказаць, што зямлю я «захапіла» да верасня 2022 года».

**Начальнік галоўнага ўпраўлення землеўпарадкавання Мінскага аблвыканкама Сяргей ШЫМУК** патлумачыў, што праблема прыйшла з боку суседзяў: «Сусед Людмілы Казіміраўны заявіў, што з-за ўстаноўленага плота яму стала праблематычна заязджаць на свой участак. Ён напісаў заяву, што жанчына захопам зямлі перакрыла яму праезд. І ёсць сведкі, якія пацвердзілі, што яна частку плота паставіла ў 2022 годзе, а частку — у 2023-м, гэта значыць, пад закон не трапляе. Па рашэнні сельвыканкама Людміла Казіміраўна павінна знесці плот».

### Пытанні, актуальныя для вобласці

У размове з журналістамі старшыня Мінскага аблвыканкама звярнуў увагу на актуальныя пытанні, якія датычацца не толькі Мядзельскага раёна, але і вобласці ў цэлым: «На самай справе, тэма электразабеспячэння прысутнічае на кожным маім прыёме. Сёння такі спосаб ацяплення і гарачага водазабеспячэння карыстаецца папулярнасцю ў насельніцтва. Тыя сродкі, якія неабходныя для задавальнення запытаў грамадзян, значныя. Яны патрабуюць і часу. Найперш мы звяртаем увагу

Кіраўнік вобласці патлумачыў, што пенсіянерка можа абскардзіць дадзенае рашэнне ў райсавеце пры ўмове, што суседзі будуць не супраць таго, што плот застанецца на ранейшым месцы. Але мясцовай уладзе трэба выехаць на месца, каб убачыць, як яно на самай справе.

### Дарогі, транспарт да райцэнтра, могілкі, магазін...

Жыхароў аграгарадка Занарач Мядзельскага раёна хвалюе агульны стан дарог і могілак, закрыццё крамы «Родны кут», адсутнасць пляжа, транспартных зносін з райцэнтрам. «На дарозе па вуліцы Міру жывога месца няма! Асфальт разбіты, яма на яме, выбоіны. Як наогул ездзіць па такой дарозе? Іншыя вуліцы ў Занарачы добраўпарадкоўваюць, рамантуюць, а на нашу вуліцу, дзе жыве 135 чалавек, не звяртаюць увагі», — скардзілася губернатару заяўніца. Не лепшы і стан дарогі, якая вядзе да мясцовых могілак. Ды і стан апошніх пакідае жадаць лепшага: «Там адно балота, людзей няма дзе хаваць! А яшчэ ў нас раней працаваў дзяржмагазін «Родны кут», але яго зачынілі, будынак выкупілі. Пакуль нічога новага не адкрылі. А ў прыватніка закупляцца дорага! У дзяржкраме нам, пенсіянерам, давалі добрыя скідкі!»

**Генеральны дырэктар ЖКГ Мінскай вобласці Юрый КУКАШУК** заявіў, што вуліца Міру ўключана на 2025 год у план па бягучым рамонце вулічна-дарожнай сеткі. Тут заасфальтуюць 610 метраў дарогі. У 2026 годзе гэтыя работы будуць завершаны. Старшыня Мінскага аблвыканкама заклікаў да добраўпарадкавання Занарачы падысці комплексна: «Гэта жывы населены пункт, у 2025 годзе за яго возьмемся грунтоўна».

На тыя населеныя пункты, якія не газіфікаваны. Зусім іншае — калі ў населеным пункце ёсць прыродны газ, як, напрыклад, у Крывічах. Калі дзяржава затрачвае немалыя сродкі на газіфікацыю, мэтазгодна выкарыстанне менавіта гэтага віду прыроднага паліва для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння».

Больш падрабязна старшыня Мінаблвыканкама спыніўся на праблеме комплекснага падыходу да добраўпарадкавання, развіцця аграгарадкоў. «Мы назіраем такія тэндэнцыі, што адны аграгарадкі развіваюцца інтэнсіўна, а іншыя, па аб'ектыўных прычынах, ідуць не ў тым кірунку. Калі мы правялі комплексны аналіз па кожным аграгарадку, умоўна кажучы, наяўнасць школы, дзіцячага садка, гаспадаркі, іншых нейкіх фактараў, зразумелі для сябе пэўнага роду градацыі гэтых населеных пунктаў, — заўважыў Аляксандр Турчын. — Аграгарадок Занарач — адзін з такіх населеных пунктаў. Ён жывы, як я кажу. Туды прыязджае вялікая колькасць дзяцей, ёсць шмат людзей, моладзі. Пра тое, што ён перспектыўны, гаворыць і такі факт: некалькі гадоў таму мы пабудавалі ў населеным пункце новую школу, бо бачылі выразную перспектыву, што сёння колькасць дзяцей у школе на працягу як мінімум пяці гадоў змяншацца не будзе».

Па выніку прыёму грамадзян было прынята рашэнне аб комплексным развіцці Занарачы: «Гэта датычыцца і пляжу, і стану дарог, і гандлёвай інфраструктуры. У наступным годзе, зайшоўшы ў аграгарадок, пастараемся максімальна ўсе гэтыя праблемы вырашыць. І тады тыя людзі, якія там пражываюць, не будуць думаць, каб з'ехаць з Занарачы. Гэта як мінімум. А як максімум — аграгарадок будзе цікавы і жыхарам іншых населеных пунктаў, якія захочуць туды пераехаць».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**фота аўтара.**

*г. Мядзел.*

Акцыя

# НА АДНОЙ ХВАЛІ

**Рэспубліканская грамадска-культурная акцыя «Марафон адзінства» на два дні завітала ў Віцебск. Горад на Дзвіне стаў сёмым пунктам на маршруце беларускай творчай эстафеты.**

Праграма марафону настолькі маштабная, што наведаць усе пляцоўкі жыхарам і гасцям культурнай сталіцы складана, аднак кожны ад малага да вялікага знайшоў самае цікавае для сябе. У Доме кіно разгарнулася выстава «Век беларускага кіно» Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм», на якой выстаўлены гармонік галоўнага героя фільма «Белыя росы», касцюм лісы Алісы з «Прыгод Бураціна» і іншыя ўнікальныя экспанаты. Упершыню ў Віцебску інфармацыйнае агенцтва БелТА прэзентавала выставу «Беларусь. Узлёт», прысвечаную 30-гадоваму шляху развіцця незалежнай Беларусі. А Выдавецкі дом «Беларусь сегодня» запрашаў на інтэрактыўную выставу «Подзвігі і лёсы партызан у дакументах».

Праект «Разам працуем, разам спяваем!», які ўжо палюбіўся працаўнікамі беларускіх заводаў і фабрык, у апошнія лістападаўскія дні завітаў на прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Вітбудтэхмаш», унітарнае прадпрыемства «Палімерканструкцыя», у лакаматыўнае дэпо горада Віцебска. Для нашых людзей, якія забяспечваюць прамысловую бяспеку краіны, дарылі музычныя падарункі на працоўным месцы ансамбль народнай музыкі «Бяседа», Ганна Благава, Андрэй Коласаў, шоу-балет «Феерыя», Гюнэш.

Са студэнтамі і прадстаўнікамі грамадскасці ў рамках праекта «Маё жыццё. Мой шлях. Мой Прэзідэнт» у Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава сустрэліся Уладзімір Андрэйчанка і Вадзім Гігін. Супрацоўнікі прадпрыемства «Марка» і Віцебскага футравага камбіната, а таксама ААТ «Нафтан» і вытворчае аб'яднанне «Энергакамплект» сустрэліся ў рамках праекта «Адну справу робім».

У рамках праекта «НЯсумная НЯлекцыя» з навучэнцамі Віцебскага дзяржаўнага індустрыяльна-тэхналагічнага каледжа і Віцебскага дзяржаўнага каледжа электратэхнікі сустрэліся намеснік міністра адукацыі Кацярына Пятруцкая, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Вячаслаў Дурноў і іншыя. У фармаце адкрытага дыялогу з гульнявым інтэрактывам некаторыя з найбольш актыўных прадстаўнікоў моладзі атрымалі квіткі на грандыёзны канцэрт «Час выбраў нас», які адбудзецца сёння ўвечары на пляцоўцы лядовага Палаца спорту.

Чым яшчэ былі насычаны дні «Марафону адзінства» ў Віцебску, чытайце ў найбліжэйшым нумары.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота БелТА.**

# У ЗОНЕ ДОСТУПУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёння сфарміравана база тэхнічных нарматыўна-прававых актаў. Патрабаванні будаўнічых норм «Асяроддзе пражывання для фізічна аслабленых асоб» абавязковыя да прымянення. Гэта азначае, што сёння не ўзвесці будынка, калі ў праектнай дакументацыі не ўлічаны пытанні комплекснай даступнасці аб'ектаў.

Нарматыўная база таксама ўвесь час абнаўляецца, і будаўнічыя нормы змяняюцца з улікам назапашанага вопыту. Напрыклад, былі канкрэтызаваны патрабаванні да ўстаноўкі мабільных пандусаў у грамадскіх будынках, тактыльнай плітк і на вонкавых лесвіцах, поручняў у санвузлах, электрычных пад'ёмных платформ у жылых дамах.

— Дзяржстандартам таксама вядзецца работа па актуалізацыі дзяржаўных стандартаў, якія рэгламентуюць пытанні даступнага асяроддзя. У рамках рэалізацыі норм закона ўрад зацвердзіў правілы забеспячэння даступнасці для інвалідаў аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры і правілы забеспячэння доступу і карыстання жылымі памяшканнямі. Гэтыя дакументы, па сутнасці, — дарожныя карты для мясцовых органаў улады, якія вызначаюць крытэрыі і патрабаванні да даступных аб'ектаў для ўсіх катэгорый інвалідаў, — падкрэсліла Вікторыя Грачыха.

Узровень даступнасці аб'екта вызначаецца ў залежнасці ад наяўнасці неабходных элементаў даступнага асяроддзя — ён можа быць нізкі, сярэдні ці высокі. Пры гэтым незалежна ад бягучага стану аб'ектаў яны павінны падвяргацца работам па забеспячэнні поўнай даступнасці. Будынкі адрозніваюцца па сваёй архітэктуры, таму да кожнага з іх патрабуецца індывідуальны падыход. Не заўсёды магчыма прымяніць устаноўленыя тэхнічныя патрабаванні ў поўным аб'ёме з-за асаблівасцяў планіроўкі. У такіх выпадках уласнікі гэтых аб'ектаў абавязаны прымаць узгодненыя з грамадскімі аб'яднаннямі меры па забеспячэнні доступу інвалідаў да месца аказання паслуг. Калі гэта немагчыма, неабходна аказаць паслугі па месцы пражывання інваліда або дыстанцыйна, што адпавядае нормам закона аб правах інвалідаў.

Работа па стварэнні даступнага асяроддзя ў жыллёвым фондзе таксама вядзецца ў рамках Дзяржаўнай праграмы «Сацыяльная абарона» на 2021—2025 гады. За час яе дзеяння плануецца забяспечыць даступным асяроддзем 1043 аб'екты. Цяпер, паводле аператыўных даных, забяспечана ўжо 728 аб'ектаў.

Як адзначыла **начальнік аддзела па эксплуатацыі жыллёвага фонду, арганізацыі і правядзенні жыллёвай рэформы ўпраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Наталля ПІХЕЛЬГАС**, паводле інфармацыі мясцовых органаў, план будзе выкананы ў поўным аб'ёме. Нават існуе магчымасць яго перавыканання, паколькі часам паступаюць заяўкі з іншых аб'ектаў, на якія аператыўна рэагуюць.

— На 1 лістапада дасягнута даступнасць аб'ектаў жылога фонду ў аб'ёме 67,9 %. Гэта дастаткова добры паказчык, але мы не спыняемся і будзем працаваць далей, — падкрэсліла Наталля Піхельгас.

## АДАПТАЦЫЯ ІНФРАСТРУКТУРЫ

Змяненні ў гарадской інфраструктуры становяцца заўважнымі для кожнага, бо з часам яна адаптуецца для розных катэгорый грамадзян. Напрыклад, закон аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі замацоўвае абавязацельствы па выдзяленні месцаў для стаянкі аўтамабіляў інвалідаў I і II групы, а таксама інвалідаў III групы з парушэннямі апорна-рухальнага апарата або тых, хто суправаджае такіх інвалідаў і дзяцей-інвалідаў. Законам таксама дадзена права бясплатнага карыстання інвалідамі аўтамабільнымі паркоўкамі.

Акрамя таго, у гарадскім асяроддзі на пешаходных пераходах, тратуарах і прыпынках устанаўліваюцца тактыльныя плітк і. Павялічваецца колькасць святлафораў з сінхроннымі гукавымі сігналамі. На будынках з'яўляюцца маўленчыя інфарматары і кантрасная маркіроўка дзвярэй. Змены датычацца таксама станцый метрапалітэна, аэра- і чыгуначных вакзалаў. Транспарт замяняецца на нізкападлогавы, закупляюцца спецыяльныя прыстасаванні для пад'ёму ў вагоны.

Работнікаў транспарту навучаюць бяспечным узаемадзеянням з пасажырамі-інвалідамі. Дзяржаўтаінспекцыя праводзіць прафілактычныя акцыі і рэйды, накіраваныя на прадухіленне парушэнняў правілаў паркоўкі на месцах, прызначаных для інвалідаў.

Работнікі арганізацый гатовы аказваць і сітуацыйную дапамогу людзям з інваліднасцю. Напрыклад, пры даванні інвалідам сацыяльных паслуг дапамога аказваецца персаналам арганізацыі. Гэта можа быць суправаджэнне або любая іншая дапамога для пераадолення існуючых бар'ераў або атрымання неабходных паслуг нароўні з іншымі грамадзянамі.

— Пры адсутнасці даступнага ўваходу ў арганізацыю ўстанаўліваюцца кнопкі выкліку з піктаграмай «Інвалід», а таксама размяшчаюцца нумары тэлефонаў для сувязі з абслуговым персаналам. Пры адсутнасці каля ўвахода ў будынак з вертыкальнымі бар'ерамі пад'ёмнай платформы выкарыстоўваюцца як альтэрнатыўныя варыянты — адкідны пандус або гусенічны пад'ёмнік, так і арганізуецца дапамога з боку персаналу. Таксама прапануецца дапамога пры адкрыцці цяжкіх дзвярэй або ўздыме па лесвіцы. Можа быць аказана любая іншая неабходная дапамога са згоды інваліда, — адзначыла Вікторыя Грачыха.

## БУДАЎНІЧЫЯ КАМПРАМІСЫ

**Генеральны дырэктар РУП «Будтэхнорм» Ігар ЛІШАЙ** адзначыў, што будаўнічыя нормы крыху шырэй адказваюць на пытанні стварэння даступнага асяроддзя і накіраваны не толькі на стварэнне ўмоў для інвалідаў, але і ўлічваюць патрэбы іншых груп — пажылых людзей, цяжарных жанчын і дзяцей.

Найбольш складаныя пытанні ўзнікаюць пры адаптацыі будынкаў, узведзеных у савецкі час і ў перыяд пасля распаду СССР.

— Тэхнічна будаўнік можа выканаць усё, але ўзнікае пытанне: што для гэтага трэба зрабіць? Перабудаваць палову будынка ці пайсці на нейкія іншыя меры, звязаныя, напрыклад, з перакладваннем інжынерных сетак, каб зрабіць адпаведную ўваходную групу. Мы ўвесь час сутыкаемся з гэтымі пытаннямі. І ў Міністэрстве архітэктуры і будаўніцтва ёсць адпаведная адміністрацыйная працэдура, якая прымяняецца ў выпадку немагчымасці рэалізацыі нейкіх мерапрыемстваў, выкладзеных у будаўнічых нормах. Гэта дазваляе рабіць абгрунтаваныя адступленні пры наяўнасці кампенсавальных мерапрыемстваў, — расказаў Ігар Лішай, прывёўшы ў якасці прыкладу ўстаноўку пад'ёмных прыстасаванняў у старых дамах, дзе ўзнікалі праблемы з эвакуацыйнымі выхадамі.

— Нам неабходна рухацца ў бок гнуткіх патрабаванняў, паколькі жорстка выканаць пэўныя ўмовы не заўсёды атрымліваецца. Аднак ёсць рашэнні, якія інваліды лічаць для сябе камфортнымі. Мы знаходзімся ў пастаянным кантакце з грамадскімі арганізацыямі інвалідаў і міністэрствамі, якія рэалізуюць дзяржаўную праграму па стварэнні даступнага асяроддзя. Шукаем кампрамісы, таму што без гэтага немагчыма дасягнуць выніку, — рэзюмаваў Ігар Лішай.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Амерыканскія кампаніі нарошчваюць вытворчасць у Кітаі

Перад уступленнем Дональда Трампа, які перамог на прэзідэнцкіх выбарах у ЗША, на пасаду кіраўніка дзяржавы амерыканскія тэхналагічныя кампаніі нарошчваюць вытворчасць кампанентаў для сваёй прадукцыі ў Кітаі. Аб гэтым са спасылкай на газету Nikkei Asia паведаміла ТАСС. Сярод гэтых кампаній такія, як Microsoft, HP і Dell. Паводле інфармацыі выдання, названыя карпарацыі імкнуцца павялічыць аб'ёмы вытворчасці, каб вырабіць як мага больш кампанентаў у чаканні таго, што Трамп выканае сваё абяцанне ўвесці павышаныя пошліны на імпарт кітайскіх тавараў. Паведамляецца, што Microsoft звярнулася да пастаўшчыкоў камплектуючых з просьбай «вырабіць больш дэталяў» для яе інфраструктуры воблачных сервераў у лістападзе — снежні. Карпарацыя таксама папрасіла пастаўшчыкоў падрыхтаваць як мага хутчэй усе дэталі гульнявой кансолі Xbox і сабраць максімальна магчымую колькасць ноўтбукаў Surface за межамі Кітая да канца наступнага года.

## Большасць французаў выступаюць за адстаўку Макрона

У Францыі 63 працэнты грамадзян выказаліся за адстаўку прэзідэнта Эмануэля Макрона ў выпадку вотуму недаверу ўраду прызначанага ім прэм'ер-міністра Мішэля Барнье. Гэта вынікае з апытання кампаніі Elabe для тэлеканала BFMTV, паведаміла РІА «Новости». Асабліва адстаўкі прэзідэнта жадаюць у лагеры прыхільнікаў правай партыі «Нацыянальнае аб'яднанне» (83 працэнты) і кааліцыі левых «Новы народны фронт» (76 працэнтаў). Пры гэтым меркаванні французаў аб неабходнасці вотуму недаверу ўраду падзяліліся: 52 % падтрымліваюць адстаўку кабміна, 48 % выступаюць супраць. Заснавальнік французскай левай партыі «Непадпарадкаваная Францыя» Жан-Люк Меланшон заклікаў Эмануэля Макрона пайсці ў адстаўку для пераадолення крызіснай сітуацыі ў Францыі. Пра гэта паведаміла ТАСС. «Ва ўмовах, калі інстытуты ўлады блакіраваны, ёсць толькі адно рашэнне — адстаўка прэзідэнта рэспублікі», — напісаў Меланшон у сацсетцы.

## Улады афганскай правінцыі Нангархар забаранілі чыноўнікам фатаграфавацца

Таксама забаронена праводзіць відэаінтэрв'ю з прадстаўнікамі сродкаў масавай інфармацыі. Аб гэтым заявіў Цэнтр афганскай журналістыкі (AFJC), паведаміла РІА «Новости». Намеснік губернатара Нангархара таксама распарадзіўся, каб усе паведамленні ад афіцыйных асоб у правінцыі перадаваліся выключна ў пісьмовай форме. СМІ ж дазваляецца выкарыстоўваць толькі выявы ўрадавых будынкаў, шыльдаў або лагатыпы. «Нангархар стаў ужо пятай правінцыяй, якая ўвяла падобныя абмежаванні», — адзначылі ў AFJC. Па звестках цэнтра, аналагічныя абмежаванні дзейнічаюць у правінцыях Кандагар, Тахар, Бадгіс і Гельменд, што ўжо прывяло да закрыцця там як дзяржаўных, так і прыватных тэлевізійных каналаў.

# НА СЛУЖБЕ ДЗЯРЖАВЕ І ЛЮДЗЯМ

## У свае 80 гадоў ветэран Дзяржаўтаінспекцыі Аляксандр КУЗЬМЕНКА актыўна займаецца грамадскай дзейнасцю і патрыятычным выхаваннем

**Завяршыўшы сваю службу ў органах унутраных спраў, учарашнія міліцыянеры і на заслужаным адпачынку не сядзяць без справы. Іх бясцэнны вопыт запатрабаваны ў штодзённай дзейнасці сённяшніх вартавых правапарадку. А дзеці, з якімі рэгулярна кантактуюць ветэраны органаў унутраных спраў, гледзячы на іх, робяць свой выбар на карысць міліцэйскай прафесіі.**

**Для палкоўніка міліцыі ў адстаўцы Аляксандра Кузьменкі сядзець дома — увогуле найгоршы расклад. У свае 80 гадоў ён нават уявіць не можа, што не будзе мець зносін з саслужыўцамі, дапамагаць ім спраўляцца з цяжкасцямі, дзяліцца ўласным вопытам з падрастаючым пакаленнем. Прызнаецца: сакрэт яго даўгалецця ў тым, што ён вельмі любіць людзей.**

### Эвакуацыя на Вялікдзень

І гэта ўзаемна. За гадзіну-паўтары, якія мы размаўлялі, напэўна, разоў пяць даводзілася спыняць дыктафон — Аляксандру Міхайлавічу тэлефанавалі члены ветэранскіх арганізацый, дзейныя афіцэры. Палкоўнік міліцыі Кузьменка — старшыня Савета ветэранаў галоўнага ўпраўлення Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі МУС Беларусі. Акрамя таго, ён узначальвае грамадскае аб'яднанне «Шчыт Чарнобыля», якое аб'ядноўвае беларускіх ліквідатараў наступстваў найстрашнейшай катастрофы сучаснасці. У абедзвюх арганізацыях — звыш пяці тысяч чалавек. У людзей — нямала праблем, пытанняў. Даводзіцца ўнікаць у кожнае, падстаўляць плячо дапамогі тым, каму гэта патрэбна.

«Мы, ветэраны міліцыі, нацэлены на адно: перадаваць свой вопыт моладзі, служыць беларускаму народу, — кажа ён. — У людзей — розныя праблемы, якія даводзіцца вырашаць. За ветэранамі замацаваны Спецыялізаваны ліцэй МУС, з выхаванцамі праводзім асветніцкую і патрыятычную работу. Дзеці цікаўныя, часам такія пытанні задаюць, што не ведаеш, як і адказаць. Напрыклад, пытаюцца, чаму я паехаў у Чарнобыль, калі там адбыўся выбух...»

Няўжо ў той страшны час супрацоўнікі органаў унутраных спраў, як і многія, маглі думаць пра сябе?! Галоўным было — дапамагчы тым, хто трапіў у бяду. У 1986 годзе, калі адбылася чарнобыльская катастрофа, Аляксандр Кузьменка ўзначальваў Дзяржаўтаінспекцыю Гомельскай вобласці. Трэба было эвакуіраваць людзей, забяспечыць захаванасць маёмасці, вырашаць іншыя, не менш адказныя, задачы.

«Менавіта на нас, як і на ўсю міліцыю Гомельшчыны, выпала вялікая доля адказных рашэнняў, якія трэба было прымаць, — узгадвае ён. — Тым больш усё трэба было зрабіць у кароткі час, у сціснутыя тэрміны. Стаяла задача — правесці эвакуацыю за суткі. Як сёння памятаю, гэта было 4 мая, акурат праваслаўныя святкавалі Вялікдзень. Людзі сядзелі за накрытымі сталамі, вакол усё квітнела, пахла. І раптам трэба было ўсё пакідаць і з'язджаць. Але нашы людзі, беларусы, усё разумелі. За суткі мы эвакуіравалі цэлыя раёны: амаль увесь Брагінскі, Нараўлянскі, Хойніцкі і іншыя. Самыя лепшыя землі трапілі ў зону эвакуацыі».

### Дзяцінства, апаленае вайной

У зону адчужэння трапіла і малая радзіма Аляксандра Кузьменкі. Яго родная вёска Гарошкаў Хойніцкага раёна пацярпела двойчы. Першы раз, у 1943 годзе, вёску дашчэнту спалілі немцы. Пасля вайны жыхары, якім пашчасціла не згарэць разам са сваімі хатамі, Гарошкаў адрадзілі. А вось з нябачным ворагам — радыяцыяй — людзі справіцца не змаглі, а таму вымушаны былі пакідаць нажытае дабро і шукаць прытулку на чужыне.

Што значыць жыць не на сваёй зямлі, Аляксандр Кузьменка добра ведае. Ён нарадзіўся ў Германіі. Яго маці і дзвюх сястрычак, а таксама аднавяскоўцаў немцы адправілі на прымусовыя работы ў Германію пасля таго, як у чэрвені 1943 года спалілі вёску. Умовы, у якіх даводзілася рабіць свае першыя крокі ў жыцці, былі няпростыя — ледзь выжылі. Ды і калі вярнуліся пасля вызвалення на Радзіму, было нялёгка. Замест хаты — папялішча. Пакуль пабудавалі новую, жылі ў зямлянцы. Неўзабаве і бацька вярнуўся з фронту. У холадзе, голадзе, але жывыя і разам — што яшчэ трэба для шчасця?!

«Чалавека цягне туды, дзе ён нарадзіўся, — кажа Аляксандр Міхайлавіч. — Як і птушку, якая ляціць на зімоўку ў цёплыя краіны, а потым вяртаецца на тое месца, дзе ёсць яе гняздо».

### Прафесійны выбар

З самага дзяцінства Аляксандр Кузьменка марыў служыць у міліцыі. На яго прафесійны выбар паўплываў наступны выпадак. Аднойчы разам з сябрамі на борце грузавога аўтамабіля ён ехаў у горад.

«Як бачым, наперадзе едзе матацыкл, — успамінае Аляксандр Міхайлавіч. — Ім кіруе статны мужчына ў скуранай чорнай форме. На матацыкле напісана — «Дзяржаўтаінспекцыя». Кіроўца нашага грузавіка таксама ўбачыў матацыкліста, адчыніў акно і крычыць нам: «Садзіцеся!» Мы ўсе палеглі, як мышы. Матацыкліст ехаў, можа, кіламетраў 40 у гадзіну, а мы за ім — не абганяем. Я ляжу і думаю, што гэта за чалавек такі, якога так усе паважаюць і баяцца. Потым даведаўся, што гэта быў супрацоўнік Дзяржаўнай аўтаінспекцыі».

Менавіта гэтая сустрэча з інспектарам ДАІ і прадвызначыла яго далейшы лёс. Аляксандр пачаў цікавіцца, куды трэба паступіць, каб атрымаць такую ж прафесію. Як і цяпер, гэта было няпроста. У Дзяржаўтаінспекцыю бралі людзей з вопытам. Прымалі і тых, хто прайшоў тэрміновую воінскую службу ў арміі.

Працоўныя будні.

Служыў Аляксандр Кузьменка на Украіне — у аўтамабільным падраздзяленні, якое абслугоўвала чыгуначныя войскі. Пасля службы ў арміі хлопец паступіў у Харкаўскае ваеннае вучылішча МУС СССР, у якім адвучыўся два гады. Пасля заканчэння вучылішча маладога чалавека запрашалі служыць у Крым, і ён даў згоду. Але, прыехаўшы ў адпачынак на Радзіму, вырашыў, што лепшай мясціны за яго родную Гомельшчыну няма.

«Былі свабодныя месцы ў Мазыры, Лоеве, у Рэчыцы, — удакладняе Аляксандр Міхайлавіч. — Адзін кадравік так маляўніча расказаў мне пра Мазыр (дагэтуль я там не быў), называў горад жамчужынай Палесся, беларускай Швейцарыяй. І я вырашыў там застацца. Відаць, гэта быў мой лёс».

### Усесаюзная будоўля і чарнобыльская бяда

У Мазыры, дзе пачалася яго служба, жыццё пайшло па-іншаму. Спачатку Аляксандр Кузьменка быў інспектарам Дзяржаўтаінспекцыі ў райаддзеле, праз два гады яму прапанавалі ўзначаліць гэтае падраздзяленне. Пагадзіўся. У выніку ў Мазыры праслужыў 12 гадоў.

Час быў цікавы. Акурат пачалося ўзвядзенне Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода, аб'яўленага ўсесаюзнай камсамольскай будоўляй. Нярэдкімі былі прыезды прадстаўнічых дэлегацый. Тагачасны першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі Пётр Машэраў, паводле ўспамінаў Аляксандра Кузьменкі, прылятаў у Мазыр па два-тры разы на месяц. Будоўля прыцягвала шмат людзей, а таму задачы, якія даводзілася выконваць міліцыі, былі надзвычай адказнымі. Як кіраўніку, адказнаму за бяспеку дарожнага руху, у той найважнейшы перыяд яму нельга было дапусціць ні аднаго сур'ёзнага дарожнага здарэння. Так і атрымалася.

«Калі пачалася гэтая гіганцкая будоўля, я зразумеў, што такое Савецкі Саюз, — заўважае Аляксандр Кузьменка. — Другі раз я ўсвядоміў моц нашай тагачаснай краіны, калі здарыўся Чарнобыль. У адзіночку з гэтай бядой было б вельмі цяжка справіцца. У ліквідацыі наступстваў аварыі брала ўдзел вялікая колькасць людзей. Калі б не шахцёры, якія правялі каласальную работу па ахаладжэнні рэактара, маштабы трагедыі маглі быць значна большымі. Таму Еўропа, якая дагэтуль у наш адрас уводзіць пэўныя абмежаванні, павінна памятаць, што мы яе фактычна выратавалі».

Аляксандр Кузьменка нагадвае: самыя лепшыя землі нашай краіны вельмі пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы. «І калі б не Аляксандр Рыгоравіч, калі б лёс не даў нам такога Прэзідэнта, думаю, Беларусі было б вельмі дрэнна, — лічыць ён, кажучы пра пільны клопат кіраўніка дзяржавы аб адраджэнні забруджаных тэрыторый і сацыяльнай падтрымцы пацярпелага насельніцтва. — Гэты чалавек неабыякавы да чужой бяды, яго смеласць, яго рашэнні заслугоўваюць павагі. Мне даводзілася бачыць многіх кіраўнікоў рознага ўзроўню, якія прыязджалі ў чарнобыльскую зону. Усе члены палітбюро Савецкага Саюза прыбывалі апранутыя, як касманаўты: у масках, скафандрах. Калі стаў Прэзідэнтам, Аляксандр Рыгоравіч прыязджаў у чарнобыльскую зону, як і ўсе мы, без ніякіх сродкаў аховы. І не проста заязджаў мімалётам, а сустракаўся з людзьмі, цікавіўся іх праблемамі. І тое, што абяцаў ім, заўсёды выконваў. Гамяльчане дагэтуль удзячныя кіраўніку дзяржавы за яго падтрымку».

З 80-гадовым юбілеем ветэрана міліцыі віншаваў міністр унутраных спраў.

Аляксандр Кузьменка не разумее некаторых суайчыннікаў, якія чымсьці незадаволены. «Якія могуць быць перамены? — задае слушнае пытанне ён. — Калі дзверы забіты машынамі (ды яшчэ якімі!), што развярнуцца нельга. Калі крамы напоўнены таварамі, шматлікімі прадуктамі. Калі ўсё, што хочаш, можна купіць без ніякага блату, што яшчэ трэба?! Пашанцавала Беларусі. Таму трэба цаніць тое, што ў нас такі лідар. Сапраўды, прэзідэнтамі не становяцца — імі нараджаюцца».

### Нечаканая прапанова і каштоўная парада маладым

Не толькі Чарнобыль выпаў на той час, калі Аляксандр Кузьменка ўзначальваў Дзяржаўтаінспекцыю Гомельскай вобласці (дарэчы, на апошняй пасадзе — 20 гадоў!). Служба супала з найцікавейшым перыядам у развіцці краіны: будаўніцтва Беларускага металургічнага завода, іншых магутных прадпрыемстваў і комплексаў, на вачах пераўтвараліся гарады, з кожным годам жыццё станавілася лепш. Высокую ацэнку дзейнасці афіцэра дало кіраўніцтва Савецкага Саюза: у 1986 годзе Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Аляксандр Міхайлавіч быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Аднак расслабляцца не даводзілася. Што такое ліхія 90-я, міліцыянеры ведаюць не па чутках. З разгулам злачыннасці змагаліся комплексна і эфектыўна. Напрыклад, як успамінае палкоўнік міліцыі ў адстаўцы, на буйных магістралях і не толькі ствараліся ўчасткі дарожнай міліцыі, дзе ў кругласутачным рэжыме неслі дзяжурства і супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі, і іншых падраздзяленняў органаў унутраных спраў. У выніку і выкраданняў аўтамабіляў, і іншых правапарушэнняў станавілася менш. Вопыт беларускіх праваахоўнікаў, як расказвае суразмоўца, пераймалі калегі з іншых рэспублік.

Аднойчы начальніка гомельскай Дзяржаўтаінспекцыі выклікаў на размову тагачасны міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў. Кіраўнік ведамства пацікавіўся, ці не здаецца Аляксандру Кузьменку, што ён доўга працуе на адным месцы, а таму прапанаваў яму перавесціся ў Мінск. Рашэнне трэба было прыняць за суткі.

Аляксандр Міхайлавіч прызнаецца, што ніколі не рваўся ў сталіцу, хоць і дагэтуль падобныя прапановы былі. Якую пасаду для яго падрыхтавалі, ён пакуль не ведаў, аднак быў перакананы — адмаўляць кіраўніцтву нельга. У выніку ў пачатку 2000-х Аляксандр Кузьменка прыбыў у Мінск, дзе служыў першым намеснікам начальніка Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі МУС. На гэтай пасадзе і завяршыў сваю службу ў органах унутраных спраў.

Ен быў адным са стваральнікаў Рэспубліканскай камісіі па бяспецы дарожнага руху. Камісія, якая функцыянуе і цяпер, займаецца вельмі шырокім спектрам пытанняў. Многія з іх вырашаюцца на ўзроўні Савета Міністраў, ведамстваў. Камісіяй прымаюцца адпаведныя заканадаўчыя і нарматыўныя дакументы.

Дарэчы, кіраўнік ветэранскай арганізацыі Дзяржаўтаінспекцыі сам з'яўляецца актыўным удзельнікам дарожнага руху. Ен — кіроўца з больш як 60-гадовым стажам. Дагэтуль выдатна адчувае сябе за рулём.

Кажучы аб сваіх маладых калегах, якія забяспечваюць парадак на дарогах, лічыць, што ім вельмі пашанцавала. «Узяць хоць бы абсталяванне для супрацоўнікаў ДАІ, клопат аб іх, — канкрэтызуе ён. — У іх усё ёсць. Галоўнае, каб было жаданне служыць народу. У нашай прафесіі заўсёды трэба быць аб'ектыўнымі, увахо дзіць у палажэнне чалавека. Калі інспектар будзе любіць людзей і несці службу дзеля іх, то ўсё будзе добра».

Такая парада ветэрана беларускай міліцыі яго маладым калегам. За сваю доўгую службу ён бачыў многае, а таму варта прыслухацца. Што і робіць адзін з яго ўнукаў, які вырашыў пайсці па дзедавым шляху, а таму паступіў у Спецыялізаваны ліцэй МУС. Аляксандр Кузьменка верыць, што дынастыі — быць. «Хацелася б, каб было мірнае неба, каб было здароўе, — дадае ён. — А калі і мірнае неба, і здароўе, то ўсё будзе».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота з архіва Аляксандра КУЗЬМЕНКІ.**

# НА ВАРЦЕ ПАРАДКУ І БЯСПЕКІ

## У Брэсце адзначылі 85-ю гадавіну са дня ўтварэння УУС Брэсцкага аблвыканкама

Фота БелТА.

**Святкаванні пачаліся з адкрыцця новай інтэрактыўнай экспазіцыі ў гісторыка-дэманстрацыйнай зале абласнога ўпраўлення УУС. Экспазіцыю прысвяцілі абаронцам чыгуначнага вакзала ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны.**

Супрацоўнікі лінейнага аддзела міліцыі чыгуначнага вакзала былі аднымі з першых, хто сустрэўся з ворагам у чэрвені 1941 года. Гераічна абараняліся брэсцкія міліцыянеры. Іх абстрэльвалі, пускалі газ, затоплівалі падвалы, дзе яны хаваліся, але мужныя абаронцы не здаваліся, трымаліся цэлы тыдзень. Большасць з іх пад напорам варожай навалы загінула. Стваральнікі экспазіцыі аднавілі тры сцэны падзей тых дзён: бой перад будынкам вакзала, абарону падвальных памяшканняў, прарыў з акружэння тых, хто застаўся ў жывых. Усё гэта можна ўбачыць з дапамогай акуляраў віртуальнай рэальнасці.

**Начальнік Брэсцкага абласнога УУС Алег ШУЛЯКОЎСКІ** сказаў, што міліцыянеры Брэстчыны шануюць традыцыі папярэднікаў, адной з якіх з'яўляецца захаванне памяці. Менавіта ў 80-ю гадавіну вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў такая экспазіцыя аказалася надзвычай запатрабаванай. Музей УУС наведваюць не толькі жыхары Беларусі, але і замежныя госці.

Пасля цырымоніі адкрыцця экспазіцыі ўсе накіраваліся да Памятнага знака супрацоўнікам, якія загінулі пры выкананні службовых абавязкаў, каб ускласці кветкі і ўшанаваць памяць калег. У Кнігу памяці брэсцкай міліцыі занесена 165 імёнаў тых, хто цаной жыцця выканаў абавязак. Ім устаноўлены помнік. Да помніка таксама прыйшлі маці і жонкі некаторых міліцыянераў-герояў. У знак вялікай павагі ім паднеслі кветкі і падарункі.

**Намеснік міністра ўнутраных спраў Дзмітрый КАРЗЮК** у размове з журналістамі адзначыў, што мерапрыемства ў гонар 85-годдзя Брэсцкага абласнога УУС стала добрай нагодай зверыць пазіцыі па службе, успомніць папярэднікаў, сустрэцца з ветэранамі. Генерал-маёр міліцыі таксама адзначыў што вартавыя парадку Брэстчыны да свайго свята падышлі з добрымі вынікамі аператыўна-службовай дзейнасці. Назіраецца зніжэнне злачыннасці, у тым ліку па лініі крымінальнага вышуку. «На нашых вуліцах спакойна, прыгожа і бяспечна. Гэта і ёсць наша галоўнае дасягненне і мэта ўсёй нашай работы», — сказаў Дзмітрый Карзюк.

На свята прыбылі і былыя кіраўнікі Брэсцкага абласнога УУС. Адзін з іх — **генерал-маёр Уладзімір ШАФАРЭНКА** — кіраваў абласной міліцыяй з 2001 да 2005 года. Тыя гады ён успамінае як надзвычай цікавы час у працоўнай біяграфіі:

— Да гэтага я ўжо праслужыў у органах міліцыі амаль 25 гадоў, дастаткова добра ведаў усю краіну. Супрацоўнікі брэсцкай міліцыі на гэтым фоне выглядалі даволі кваліфікаванымі, належным чынам падрыхтаванымі, гэта былі людзі, з якімі добра было працаваць і вырашаць пастаўленыя задачы, — сказаў Уладзімір Мікалаевіч. — Мы шмат чаго зрабілі разам, правялі мадэрнізацыю дзяжурных часцей як у раёнах, так і ў абласным упраўленні, паставілі на службу міліцыі лічбавізацыю, палепшылі ўмовы знаходжання патрульна-паставой службы, мы нават адпаведным чынам зарэгістравалі і правялі латарэю, сродкі ад якой накіравалі на развіццё тэхнічнага складніка міліцыі. У Брэсце было цікава працаваць, жыхары горада і вобласці запомніліся як добразычлівыя, пазітыўныя людзі.

Тым часам каля Палаца культуры прафсаюзаў разгарнуліся інтэрактыўныя пляцоўкі ў рамках акцыі «За бяспеку — разам». Сюды прыйшлі выхаванцы профільных класаў прававой накіраванасці, гараджане, моладзь, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. У Палацы культуры адбыліся таксама ўрачыстае пасяджэнне і святочны канцэрт, прысвечаны героям дня.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Тонкасці прафесіі

# ПРАЦОЎНЫЯ БУДНІ МАЁРА МІЛІЦЫІ МАКАРЭВІЧА

## Адзін з найлепшых участковых Магілёва — пра шлях да мары і прафесійныя будні

**У 2023 годзе па выніках работы за першае паўгоддзе Савет грамадскага пункта аховы правапарадку № 9, дзе на той час служыў Максім Макарэвіч, быў прызнаны найлепшым. Сёння супрацоўнік органаў унутраных спраў — старшы інспектар апорнага пункта № 11, які кантралюе не менш адказны ўчастак горада — мікрараён вуліц Сіманава — Куцепава і таксама дэманструе высокія паказчыкі ў рабоце сярод старшых участковых Кастрычніцкага РАУС. Служба яму падабаецца, а гэта галоўнае. Пра тое, якія выхаваўчыя метады прымяняе ён у сваёй рабоце і як органы ўнутраных спраў забяспечваюць ахову правапарадку, — у размове з Максімам Макарэвічам.**

### ПРАФЕСІЯ СТАЛА ПРЫЗВАННЕМ

Цікавая акалічнасць. Максіму Сяргеевічу ўсяго 29 гадоў, а ён ужо маёр. За гэты адрэзак жыцця паспеў скончыць Магілёўскі інстытут МУС і Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце. Малады супрацоўнік зарэкамендаваў сябе на сваім службовым месцы як перспектыўны высакакласны спецыяліст. Ён карыстаецца аўтарытэтам сярод калег і павагай сярод насельніцтва.

З будучай прафесіяй Максім Макарэвіч вызначыўся яшчэ ў школе. Калі вучыўся ў 11 класе, яму на дамашні адрас прыйшоў ліст з ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама з прапановай атрымаць вышэйшую міліцэйскую адукацыю.

— Параіўся з бацькамі і вырашыў, а чаму б не, — расказвае суразмоўнік. — Вучыўся нядрэнна. Сярэдні бал быў «сем». Бацькі ў міліцыі не працавалі, а я вось зацікавіўся.

Самае складанае было прайсці медыцынскую камісію — адбор быў сур'ёзны. У 2013 годзе прайшоў камісію, здаў цэнтралізаванае тэсціраванне і пайшоў вучыцца. Паступіў у вышэйшы міліцэйскі каледж, які праз год памяняў статус і стаў інстытутам. Прызнаецца, што першы год было цяжка і фізічна, і маральна. Жыць па ўставе даволі складана, але час ішоў і хлопец уцягнуўся. Прадметы даваліся лёгка, атрымліваў павышаную стыпендыю, у залікоўцы з першага да апошняга курса адзнакі былі ад «сямі» і вышэй. Пасля інстытута завочна скончыў Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Другі дыплом і званне магістра кіравання і права атрымаў у 2019 годзе.

### НА ВАРЦЕ ПРАВАПАРАДКУ

Вучобу ў акадэміі сумяшчаў з работай у апорным пункце № 9, куды яго накіравалі ўчастковым інспектарам міліцыі пасля заканчэння Магілёўскага інстытута МУС.

— Бывала, што не паспяваеш вярнуцца з аднаго вызаву, як зноў трэба збірацца на новы, — успамінае суразмоўнік. — Нехта тэлефон страціў, нехта гучна слухае музыку, нехта скандаліць, нехта перабраў гарэлкі — трэба разбірацца. Акрамя таго, займаешся бягучымі справамі — праверкай «падуліковых» асоб, зваротамі грамадзян, іншай работай. Участак быў няпросты: свая спецыфіка, шмат крам. Але спраўляўся, і кіраўніцтва гэта ацаніла.

У 2021 годзе руплівы ўчастковы атрымаў пасаду старшага ўчастковага інспектара, цяпер ён каардынуе дзейнасць участковых апорнага пункта № 11. У падначаленні — шэсць участковых, у тым ліку адна дзяўчына. Гэта першае яе працоўнае месца пасля ВНУ. Калегі ставяцца да гэтага з паразуменнем, бяруць больш складаных «кліентаў» на сябе. «Дзяўчына старанная, — ацэньвае магчымасці маладой супрацоўніцы старшы ўчастковы. — З некаторымі заданнямі спраўляецца не горш, чым мужчыны. У нашай прафесіі вынік залежыць не ад таго, якога ты полу, а як адносішся да справы».

### АХВЯРЫ «ЗЯЛЁНАГА ЗМЕЮ»

Мікрараён Сіманава — Куцепава — адзін з самых вялікіх і напружаных у горадзе, і плошча яго немаленькая. Ад апорнага пункта да крайняй кропкі — досыць вялікая адлегласць. Большасць негатыўных выпадкаў звязана менавіта з пітушчымі. Старшы ўчастковы лічыць, што ўжыванне алкаголю — не сумяшчальнае са здаровым ладам жыцця. Гэта ён спрабуе растлумачыць і жыхарам. На жаль, не да ўсіх даходзіць. І тады прымаюцца больш дзейсныя меры.

— Тых, хто ў нецвярозым стане парушае грамадскі парадак і нічога не хоча мяняць у жыцці, накіроўваем на прымусовае лячэнне, — расказвае ён. — Асабліва, калі пасля першага папярэджання чалавек зрабіў яшчэ адно адміністратыўнае правапарушэнне. Часцей за ўсё гэта сямейныя скандалісты, якія не даюць спакойна жыць сваякам. Часта бывае, што маці-пенсіянерка ўтрымлівае гора-сына 35-40 гадоў, які нідзе не працуе, п'е і скандаліць. Такіх людзей, вядома, трэба ізаляваць у ЛПП (лячэбна-працоўны прафілакторый). Калі няма ніякіх медыцынскіх супрацьпаказанняў, накіроўваем матэрыялы ў суд і адпраўляем на лячэнне. Яны там і працуюць, і штрафы свае аплачваюць. Ёсць шанц, што такі чалавек перастане злоўжываць гаручымі напоямі, а родныя адпачнуць ад скандаліста.

Аматары «зялёнага змею» дэградзіруюць вельмі хутка. Як наступствы — асацыяльны лад жыцця, абыякавасць да дзяцей, адмаўленне ад работы. З гэтай катэгорыяй міліцыя працуе вельмі шчыльна.

— У адпаведнасці з Дэкрэтам Прэзідэнта № 18 абавязаныя асобы павінны кампенсаваць дзяржаве выдаткі на ўтрыманне іх непаўналетніх дзяцей, — удакладняе Максім Макарэвіч. — Калі яны злоўжываюць спіртным, прагульваюць работу, рыхтуем дакументы і перадаём у суд. Сярод такіх асоб больш жанчын, іх таксама прыходзіцца накіроўваць у ЛПП. Некаторыя потым бяруцца за розум, кідаюць піць, аднаўляюцца ў правах на выхаванне сваіх дзяцей і жывуць прыстойна. А тыя, хто не хоча чуць ні пра нас, ні пра сваіх родных, паўторна вяртаецца ў ЛПП.

### НЕ ГОРШЫ ЗА АНІСКІНА

Героя савецкіх серыялаў — участковага Аніскіна — калісьці ведалі ўсе, але сёння хапае іншых аўтарытэтаў. І Максім Макарэвіч бярэ прыклад з іх. Нягледзячы на досыць малады ўзрост, стаж у міліцыі ў яго больш чым 11 гадоў. Шмат каго выратаваў, шмат каму дапамог. Быў выпадак, звярнулася маладая дзяўчына, якая страціла тэлефон па дарозе дамоў. Патлумачыла, што ішла з трэніроўкі, зайшла ў краму, потым ехала на аўтобусе. Старшы ўчастковы прайшоў увесь шлях дзяўчыны, каб аднавіць дэталі. Пры прагляддзе запісаў з відэакамер крамы заўважыў той самы тэлефон на стойцы. Праз некалькі хвілін яго забрала нейкая жанчына. Яе асоба была аператыўна ўстаноўлена, тэлефон канфіскаваны і вернуты гаспадыні.

Успомніў суразмоўнік выпадак са свайго былога месца службы на пункце аховы грамадскага парадку № 9. Паступіла паведамленне з разраду «сямейны скандал». Патэлефанавала дзяўчына, якая паскардзілася, што да яе прыйшоў былы хлопец і пачаў разборкі. Нарад выехаў, але скандаліста на месцы не аказалася — збег. Дзяўчына вельмі перажывала, што вернецца. На вуліцы — глухая ноч, а яе кватэра на першым паверсе. Участковы супакоіў і даў нумар свайго мабільнага тэлефона на выпадак, калі скандаліст вернецца.

— Толькі мы паспелі ад'ехаць, як яна тэлефануе і ў паніцы крычыць, што мужчына б'е шкло ў яе акне, — расказвае Максім Макарэвіч. — Мы ўключылі «мігалкі» і хутка вярнуліся назад. Правапарушальнік быў затрыманы на месцы правапарушэння.

Жыццём рызыкаваць маёру, на шчасце, не прыходзілася, але газавым балончыкам аднойчы скарыстаўся. У час работы ўчастковым пайшоў затрымліваць абавязаную асобу, каб прымусіць пайсці на работу. Жанчына жыла на Лупалава ў прыватным доме. Па тэлефоне не адказвала, але дзверы ў яе дом былі адчынены. Міліцыянер зайшоў, а там — чатыры сабакі. Трэба было абараняцца.

Быў кур'ёзны выпадак, калі грамадзянін хаваўся ад міліцыянера ў шафе. Сужыцелька сказала, што яе прыяцеля няма дома. Участковы тады папрасіў дазволу агледзець кватэру, яна не пярэчыла. Спрактыкаванае вока адразу ж угледзела не шчыльна прыкрытыя дзверцы шафы, за імі, як высветлілася, і хаваўся парушальнік. Жанчына ж толькі здзіўлены твар зрабіла: маўляў, сама не чакала.

— Бываюць людзі адэкватныя, якія, калі вінаватыя, не ўхіляюцца ад пакарання, разумеюць, што гэта бессэнсоўна, — расказвае маёр міліцыі. — А вось некаторыя хаваюцца, бегаюць. Ад таго ж накіравання ў ЛПП. Пакуль рашэнне суда ўступае ў сілу, чалавек паспявае знікнуць. Быў выпадак, што мужчыну асудзілі на лячэнне ў 2020 годзе, а ён знік. Хутка яго дэпартавалі з Расіі, і мы выканалі рашэнне суда. Тэрміну даўнасці накіраванне ў ЛПП не мае.

На думку міліцыянера, лячэбна-працоўны прафілакторый — адзін з дзейсных спосабаў барацьбы з алкагалізмам. Па-першае, сям'я адпачне ад дэбашыра. Па-другое, чалавек, пакуль лечыцца, кампенсуе дзяржаве выдаткі. Па-трэцяе, новых злачынстваў не здзяйсняе, знаходзіцца пад кантролем. Злоўжыванне спіртным нікога да дабра не даводзіла.

— Работа ўчастковых накіравана на прафілактыку, — рэзюмуе Максім Макарэвіч. — Прыходзіцца шмат гутарыць з людзьмі, каб яны ўзяліся за розум. Работа наша напружаная, але я ўжо без яе сябе не ўяўляю. Нават у водпуску цягне на службу. Два-тры дні дома пабыў і іду да сваіх на «апорку». Аднойчы, каб не адцягваць калег ад работы, падчас водпуску суправаджаў жанчыну ў ЛПП у Горкі. Высокія паказчыкі дасягаюцца толькі сумленным выкананнем сваіх абавязкаў, нават не лічачыся з асабістым часам. Мяняць нешта ў жыцці не збіраюся. Калі выбраў для сябе такі шлях, трэба станавіцца прафесіяналам. А бегаць туды-сюды жыцця не хопіць. Неабходна займацца сваёй справай і прыносіць карысць. Я нават у інстытуце сваё 18-годдзе сустрэў у нарадзе паставога. Родныя прыехалі, торцік прывезлі, а я выбег толькі на хвіліну, падзякаваў і — «да пабачэння». Так, я строгі і да сябе, і да навакольных.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота з архіва Кастрычніцкага РАУС г. Магілёва.**

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Лот № 1:** капитальное строение с инвентарным номером 161/С-20596 (наименование: жилой дом; назначение: здание одноквартирного жилого дома), площадью 46,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Каменецкий р-н, Волчинский с/с, д. Волчин, ул. Ленина, 52, на земельном участке с кадастровым номером 124081701601000285, площадью 0,2049 га, составные части и принадлежности: терраса, сарай с погребом, гараж, два сарая, навес, уборная

| Начальная цена, руб. | 28 767,12 | Размер задатка, руб. | 2 876,71 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Беловежский», Брестская обл., Каменецкий р-н, аг. Беловежский, ул. Ленина, 2, тел. 80163172881. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 17 декабря 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 16 декабря 2024 г. до 17.00**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению **ОАО «Деревное»** (продавец) проводит открытый аукцион

## ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ АТС

**с инв. № 622/С-48629 общей площадью 98,6 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625485805101000201 (право аренды по 30.05.2039) площадью 0,0518 га по адресу: Минская область, Столбцовский район, Деревнянский с/с, д. Нивное, ул. Садовая, 8А.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона линий связи и радиофикации, пл. 0,0101 га, охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,142 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 13 747,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 1 374,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **03.01.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.12.2024** до **15.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: 8 (017) 175-82-98, 8 (017) 175-82-17.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже движимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2024.Г.002.00138** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by

**Продавец:** Минская центральная таможня, 220007, г. Минск, ул. Могилевская, 45/3, тел. 80172189460

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 27.12.2024** в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Легковой автомобиль KIA MAGENTIS с эксплуатируемым имуществом, год выпуска 2008, рег. номер 7XE T 3420 (9413IM-7) тип – легковой седан, кузов № KNAGE227295280090, цвет – серый, инвентарный № 01500171.

**Нач. цена:** 12 600,00 бел. руб. без НДС.

**Задаток:** 1260,00 бел. руб.

**Место нахождение предмета электронных торгов:** г. Минск, ул. Холмогорская, 57.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением «О порядке проведения электронных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608, и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 26.12.2024.**

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

Извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона)

| Организатор публичных торгов (аукциона) | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
|---|---|
| Продавец | ЗАО «Мальва-проспект», 223028, Минская обл., Минский р-н, с/с Ждановичский, аг. Ждановичи, ул. Линейная, д. 3, каб. 303 |

**Предмет публичных электронных торгов (аукциона)**

**Первые повторные публичные торги (аукцион). Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 08.09.2023 в газете «Звязда» № 174 (30054), стр. 14**

| Лот, № | Наименование | Начальная цена без НДС, в долл. США в эквиваленте по курсу НБ РБ на день проведения торгов |
|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение (магазин «Цветы»), расположенное по адресу: г. Минск, ул. Карла Либкнехта, 90, общ. пл. 192,5 кв. м** | **350 000,00** |

**Задаток 3 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг аукциона** – 5 % от начальной цены лота

Информация об имуществе, условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета торгов (аукциона): 10 (десять) рабочих дней** со дня заключения договора купли-продажи

**Торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги», размещенном по адресу: https://iintorgi.by**

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить **2 % от цены продажи лота в случае, если цена продажи лота составит до 500 тыс. белорусских рублей, 1 % от цены продажи лота в случае, если цена продажи лота составит свыше 500 тыс. белорусских рублей в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

Объект аукциона не находится под арестом, в залоге, судебный спор по нему не ведется, отсутствуют обременения третьих лиц (кроме ипотеки ОАО «Банк БелВЭБ», которая будет снята после оплаты покупателем стоимости объекта аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона): 10.12.2024,** начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Торги проводятся на электронной торговой площадке https://iintorgi.by

| Дата и время окончания приема заявок | Заявки на участие в публичных электронных торгах (аукционе) принимаются с 30.11.2024 по 09.12.2024 г. до 16.00 |
|---|---|
| Контактные данные | Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by |

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Лот:** капитальное строение с инвентарным номером 100/U-90491 (наименование: незавершенное законсервированное капитальное строение; назначение: здание неустановленного назначения) площадью 2754,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Знаменский с/с, 120/18, на земельном участке с кадастровым номером 121280800001000025 площадью 0,2478 га

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 47 840,00 | Размер задатка, руб. | 4 784,00 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «СКО «Брестагроздравница», Брестская обл., Брестский р-н, район п. Берестье, тел./факс 80162 94 13 34. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 17 декабря 2024 г. в 14.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 16 декабря 2024 г. до 17.00**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении электронных торгов **31.12.2024**

## ЛОТ № 1: ТОРГОВОЕ ПОМЕЩЕНИЕ с инв. № 500/D-708042826, 12,0 кв. м.

Адрес: г. Минск, ул. Неминга, 3-258.
Начальная цена без НДС – 79 000,00 руб. Задаток – 2 370,00 руб.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **26.12.2024 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by. Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению **ОАО «Гомельский домостроительный комбинат»** (продавец) извещает о проведении **31 декабря 2024 года** открытого аукциона по продаже имущества в **12.00** по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| Наименование имущества |
|---|
| **Лот № 1:** капитальное строение с инвентарным номером 350/С-223043 площадью 1252 кв. м (главный корпус ТО автомобилей, назначение – здание неустановленного назначения, составные части и принадлежности: две пристройки, сени, пять сараев, навес, забор, мощение (асфальтобетонное), ворота металлические). Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-223047 площадью 126 кв. м (контрольно-пропускной пункт, назначение – здание неустановленного назначения, составные части и принадлежности: пристройка, пристройка (диспетчерская), пристройка (проходная), пристройка (складские помещения). Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-223045 площадью 269 кв. м (бытовое здание, назначение – здание неустановленного назначения, составные части и принадлежности: две пристройки) |
| Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 340100000005008411 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 287 |
| **Начальная цена** продажи с НДС – 709 680,00 бел. руб. **Задаток** с НДС – **10 000,00** бел. руб. |

**Продавец:** ОАО «Гомельский домостроительный комбинат», г. Гомель, ул. Лазурная, 17. Контактный телефон +375 (29) 373-08-42.

**Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной аукционистом цены продажи предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца: р/с BY12BLBB30120400071166001001** в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, БИК BLBBBY2X, УНП 400071166.

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 30.12.2024 г. в 15.00.**

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается организатором в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) банковских дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в следующем порядке: **50 %** – в течение **10 (десяти)** календарных дней с момента подписания договора купли-продажи, оставшуюся часть **равномерными ежемесячными** платежами в течение **6 (шести)** месяцев с момента подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов 1 % в течение **5 (пяти) рабочих дней** с даты подписания протокола. Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем, будет учтен в счет окончательной стоимости объекта. Аукцион проводится в соответствии с Положением ООО «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Конт. тел. организатора аукциона:**
**+375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.**

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321, тел.: 017 516-80-61) по поручению **отдела культуры Молодечненского районного исполнительного комитета** (продавец, место нахождения: Минская область, г. Молодечно, ул. Виленская, 6, тел. 0176 77-16-32) проводит повторный открытый аукцион

## ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ с инв. № 630/D-45414 (наименование: детская библиотека «Верасок»),

**общей площадью 864,1 кв. м, расположенного по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 121В-3.**

Сведения о земельном участке: кадастровый номер – 624000000003000674, площадь – 0,1474 га (постоянное пользование, доля в праве – 57/100).

Начальная цена **– 273 700,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **27 370,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 30 %.**

Информация о торгах опубликована на сайтах: minsk-region.gov.by, rlt.by, gki.gov.by, порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 15.12.2023, 14.02.2024, 08.05.2024, 25.07.2024, 31.10.2024.

Аукцион состоится **17.12.2024** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.12.2024** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: 8 (0176) 52-91-76.**

УНН 601058195

## ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – унитарного предприятия по оказанию услуг «ВРТЭК»

(УНП 291194141, г. Минск, ул. Жуковского, д. 11А, комн. 20).

***Дата и время проведения торгов*: 31 декабря 2024 года.**
Начало – 10.00. Заявки принимаются с 30 ноября 2024 года по 30 декабря 2024 года.

***Место проведения торгов:*** г. Минск, пр-т Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:*** **УП по оказанию услуг «ВРТЭК» (УНП 291194141)** в лице ликвидатора – ООО «Юридическое агентство «КлеверКонсалт», директор Колыско А.А.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %.

Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайте https://specrealization.by.

Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

# Справа жыцця Аркадзя Шкляра

**Імя прафесара Аркадзя Шкляра звязана з прафесійнай адукацыяй. Усё жыццё ён прысвяціў развіццю гэтай галіны, добра ведаў яе знутры і разумеў, што трэба рабіць для таго, каб ствараць умовы для падрыхтоўкі кадраў, запатрабаваных у эканоміцы. У 1983 годзе ён стаў дырэктарам Мінскага сярэдняга ПТВ № 158 машынабудавання, а ў 1993—2017 гадах узначальваў Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі. У 1989 годзе па яго ініцыятыве была падрыхтавана і прынята Саветам Міністраў БССР пастанова «Аб эксперыменце па бесперапыннай падрыхтоўцы кваліфікаваных рабочых і тэхнікаў». Упершыню ў прафесійнай адукацыі СССР і замежных краін быў рэалізаваны праект па стварэнні сістэмы бесперапыннай падрыхтоўкі кадраў па схеме ПТВ — ССНУ — ВНУ.**

Аркадзь ШКЛЯР на сустрэчы з калегамі ў каледжы сучасных тэхналогій у машынабудаванні і аўтасэрвісе.

«У пачатку 1990-х гадоў пры распадзе СССР Рэспубліка Беларусь не мела сваёй навуковай школы, вопыту распрацоўкі навукова-метадычнага забеспячэння прафадукацыі, цэласнай сістэмы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі работнікаў сістэмы прафадукацыі. Было шмат праблем у пытаннях захавання і развіцця сістэмы падрыхтоўкі кадраў для розных галін эканомікі. І толькі дзякуючы пастаяннай увазе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь да развіцця сістэмы адукацыі, у тым ліку прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай, наша краіна змагла захаваць і развіць сістэму прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі», — успамінае Аркадзь Хонанавіч. Ён адзначыў, што вялікую ролю ў захаванні сістэмы прафадукацыі сыгралі Міністэрства адукацыі Беларусі, органы дзяржкіравання, прадпрыемствы і арганізацыі. Каардынацыю работы па развіцці сістэмы прафадукацыі ў 1990-я гады ажыццяўляў Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі, яго супрацоўнікі, вучоныя, прафесарска-выкладчыцкі састаў, метадычныя службы і эксперыментальныя пляцоўкі — установы прафадукацыі, якія ўвайшлі ў структуру РІПА. У 2011 годзе інстытут атрымаў статус Базавай арганізацыі дзяржаў — удзельніц СНД па прафесійнай падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі кадраў у сістэме прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі з функцыямі апрабацыі і распаўсюджвання вучэбна-метадычных і навукова-даследчыцкіх распрацовак. У 2014 годзе па ініцыятыве Аркадзя Шкляра і пры падтрымцы Урада Рэспубліка Беларусь афіцыйна ўступіла ў асацыяцыю WorldSkills International і стала 68 краінай — удзельніцай гэтага міжнароднага руху. У 2016 годзе пры падтрымцы ўрада і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь пачалася рэалізацыя праекта, які не меў аналагаў у краінах СНД і Еўропы, па стварэнні на базе філіяла РІПА «ЭкаТэхнаПарк — Волма» дэманстрацыйнай пляцоўкі ў галіне энергетыкі, энергазберажэння і экалогіі з выкарыстаннем вучэбнага і вытворчага абсталявання, якое дазваляе розным катэгорыям насельніцтва вывучаць сучасныя тэхналогіі.

**«Ім была створана ўнікальная школа падрыхтоўкі кадраў для машынабудаўнічай вытворчасці: гэта былі і новыя віды станкоў з лічбавым праграмным кіраваннем, і новыя адукацыйныя тэхналогіі, і новыя кваліфікацыі, і інтэграцыя вучэбных праграм ад працоўнага да спецыяліста сярэдняга звяна і інжынера.»**

У Рэспубліцы Беларусь была распрацавана і зацверджана стратэгія развіцця падрыхтоўкі кадраў для сацыяльна-эканамічнага комплексу. Цяперашняе пакаленне кіраўнікоў, вучоных, метадычных службаў РІПА паспяхова рэалізоўвае стратэгію падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў для інавацыйнай і лічбавай эканомікі, забяспечвае апрабацыю і ўкараненне найлепшых сусветных практык па прымнажэнні чалавечага капіталу для ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь», — падкрэслівае Аркадзь Шкляр.

Гэтымі днямі Аркадзь Хонанавіч адзначае 75-гадовы юбілей, віншаванні яму ідуць ад калег, разам з якімі ён ствараў сучасную сістэму прафесійнай адукацыі.

**Васіль СТРАЖАЎ, міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь з 1994 да 2001 года:**

*«У 1989 годзе было прынята рашэнне Савета Міністраў БССР аб рэформе сістэмы адукацыі, якая закранала і вышэйшую, і сярэднюю школы, і прафтэхадукацыю. У рамках рэформы пашыраліся магчымасці вучылішчаў: чалавек, які прыходзіў са школы ў ПТВ, мог побач з тэхнічнай адукацыяй атрымаць і агульную сярэднюю і сярэднюю спецыяльную адукацыі. Гэта быў вельмі правільны і своечасовы крок, які адпавядаў патрабаванням развіцця грамадства. Першапраходцам у СССР і першым у БССР быў Аркадзь Шкляр. Пры яго непасрэдным удзеле і пад яго кіраўніцтвам ПТВ было рэарганізавана ў вышэйшае прафесійнае вучылішча, якое пашырала адукацыйныя магчымасці ўстановы: пасля яе заканчэння моладзь магла паступаць на трэці курс політэхнічнага інстытута. Гэты вопыт быў запатрабаваны для далейшага развіцця многіх ПТВ краіны».*

**Пётр ПАРХОМЧЫК, старшыня Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта:**

*«З Аркадзем Хонанавічам мы пазнаёміліся ў канцы 1990-х. У той час вялікая колькасць спецыялістаў, неабходных МТЗ, рыхтавалі ў Мінскім вышэйшым прафесійным вучылішчы, што ўвайшло ў склад РІПА, які ўзначальваў Аркадзь Шкляр. Ім была створана ўнікальная школа падрыхтоўкі кадраў для машынабудаўнічай вытворчасці: гэта былі і новыя віды станкоў з лічбавым праграмным кіраваннем, і новыя адукацыйныя тэхналогіі, і новыя кваліфікацыі, і інтэграцыя вучэбных праграм ад працоўнага да спецыяліста сярэдняга звяна і інжынера».*

**У 2016 годзе пры падтрымцы ўрада і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь пачалася рэалізацыя праекта, які не меў аналагаў у краінах СНД і Еўропы, па стварэнні на базе філіяла РІПА «ЭкаТэхнаПарк — Волма» дэманстрацыйнай пляцоўкі ў галіне энергетыкі, энергазберажэння і экалогіі з выкарыстаннем вучэбнага і вытворчага абсталявання, якое дазваляе розным катэгорыям насельніцтва вывучаць сучасныя тэхналогіі.**

**Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы з 2017 да 2024 года, старшыня Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях і член Савета Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**

*«З Аркадзем Хонанавічам мы знаёмыя больш за 10 гадоў. Аб'яднала нас вельмі цікавая і актуальная тэма — удасканаленне нацыянальнай сістэмы кваліфікацый. Як забяспечыць на рынку працы баланс попыту і прапановы, падрыхтоўку кадраў пад заказ найманальнікаў, укараненне прафесійных стандартаў, незалежнай ацэнкі і сертыфікацыі кваліфікацый? Пытанні, бясспрэчна, маштабныя і вельмі складаныя. Галоўнае на старце — трэба было стварыць каманду зараджаных на вырашэнне гэтай задачы людзей. «Жывыя» прэзентацыі, упэўненасць і аргументаванасць па кожным пытанні, іскрынка ў яго вачах дазвалялі мне, здавалася, вырашаць немагчымае. Па факце ёсць каманда прафесіяналаў, не адзін дзясятак прафесійных стандартаў і сектаральных саветаў, падрыхтаваны праект закона».*

**Сяргей МАСКЕВІЧ, міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь з 2010 да 2014 года:**

*«Калі я наведваў установы ПТВ, бачыў высокі аўтарытэт Аркадзя Хонанавіча ў сістэме адукацыі краіны. Ён асабіста і РІПА, якім ён кіраваў, цалкам арганізавалі і метадычна забяспечвалі сістэму прафесійнай адукацыі Рэспублікі Беларусь. Назаву толькі некалькі рэалізаваных праектаў, ініцыіраваных і на сваім узроўні арганізаваных Аркадзем Хонанавічам. Адзін — гэта далучэнне Рэспублікі Беларусь да міжнароднага руху WorldSkills, што вывела імідж сістэмы прафесійнай адукацыі на новы ўзровень. Другі — праектаванне і стварэнне галіновых адукацыйных рэсурсных цэнтраў, у прыватнасці адкрыццё міжгаліновага рэсурснага цэнтра ў галіне экалогіі, энергетыкі і энергаэфектыўнасці «ЭкаТэхнаПарк — Волма» для забеспячэння эканомікі краіны высокакваліфікаванымі кадрамі (ад працоўнага да інжынера). Для мяне было важна, што ён з'яўляўся перакананым прыхільнікам падрыхтоўкі спецыялістаў па патрэбных для краіны галінах эканомікі з выкарыстаннем сусветнага вопыту арганізацыі навучальнага працэсу і яго сучаснага тэхнічнага абсталявання. Аркадзь Хонанавіч меў вялікі навукова-арганізацыйны аўтарытэт і сувязі за межамі Беларусі. Ён развіваў плённае супрацоўніцтва з калегамі з Расіі і Сярэдняй Азіі, якое ў той час рэалізоўвалася ў навукова-метадычнай галіне і было палітычна і эканамічна перспектыўным для сістэмы адукацыі нашай рэспублікі».*

**Міхаіл ЖУРАЎКОЎ, міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь з 2014 да 2016 года:**

*«Прафесар Шкляр уяўляе сабой увасабленне сучаснага «start-up»-праекта ў галіне прафесійнай адукацыі. Кваліфікацыя, інтуіцыя, імкненне да пошуку новага дазваляе яму прасоўваць і рэалізоўваць праекты сусветнага ўзроўню. Чалавек неардынарны, неўтаймоўны. Накіраваны на поспех, на дасягненне пастаўленых мэт».*

**Генадзь АЛЯКСЕЕНКА, першы намеснік міністра спорту і турызму з 1999 да 2003 года, былы памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па пытаннях фізічнай культуры, спорту і развіцця турызму:**

*«Сярод вялікай колькасці людзей, з якімі сутыкаешся па службовых абавязках, ёсць некаторыя, хто пакідае ў тваім жыцці след, і толькі адзінкі з іх становяцца сябрамі. Такім сябрам стаў Аркадзь Хонанавіч. Незалежна ад сферы дзейнасці ён пастаянна знаходзіцца ў пошуку, заўсёды мае вялікую колькасць ідэй, і, галоўнае, ён вельмі мэтанакіраваны чалавек, для якога няма перашкод. З пазіцый сваёй праўды, логікі, аргументаў. Ён можа даказаць неабходнасць рэалізацыі той ці іншай ідэі, яе карысць для краіны. Калі я працаваў віцэ-прэзідэнтам алімпійскага камітэта, яго ўнёсак у развіццё спорту быў высока ацэнены, хаця гэта не было яго асноўнай работай. Ён быў узнагароджаны медалём «За выдатныя заслугі» Нацыянальнага алімпійскага камітэта».*

**Вадзім БОГУШ, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі:**

*«Прафесар Шкляр — сапраўдны прафесіянал і вялікі чалавек: і па маштабах праектаў, і па ўменні рассоваць межы, і па жаданні зазірнуць за гарызонт і наблізіць будучыню, рэалізаваць яе на практыцы. Валодаючы ўнікальнымі здольнасцямі вядзення перагавораў і фарміравання камандной работы, Аркадзь Хонанавіч шмат увагі ўдзяляе самым перадавым падыходам і тэхналагічнаму складніку, які раскрывае яго таленты педагога, інжынера, архітэктара адукацыйнага працэсу».*

**Алена САКАЛОВА.**

# ЛЕТАПІС ЖЫЦЦЯ БЕЛАРУСКІХ ЖАНЧЫН

**У лістападзе 1924 года выйшаў у свет першы нумар часопіса «Беларуская работніца і сялянка», які за ўсю сваю доўгую гісторыю не раз мяняў назвы, а сёння вядомы як «Алеся»**

**За стагоддзе айчыннае перыядычнае выданне для жанчын знайшло шлях да сэрцаў многіх пакаленняў сучасніц і стала сапраўдным летапісам жыцця беларусак. У савецкі перыяд «Работніца і сялянка» распаўсюджвалася па ўсёй вялікай краіне, а тыраж даходзіў да 1,5 мільёна экзэмпляраў. Гаспадыні рознага ўзросту выразалі і захоўвалі артыкулы з парадамі па выхаванні дзяцей, рэцэпты і выкрайкі, вершы і апавяданні, што друкаваліся на старонках часопіса.**

Калі скласці ўсе нумары, атрымаецца вялізны том гісторый пра гераінь, якія вызначалі жаночае аблічча Беларусі. З вокладак глядзяць працаўніцы заводаў і будоўляў, заатэхнікі, настаўніцы, актрысы, спявачкі, мастачкі... Кожная з іх з'яўляецца прыкладам для сучасніц, бо жанчына — гэта не толькі пра прыгажосць, але і пра сілу, творчасць, майстэрства і адданасць сваёй справе.

У юбілейныя гады рэдакцыя з цеплынёй і гонарам успамінала гісторыю выдання, дзялілася дасягненнямі. Часопіс віншавалі вядомыя людзі краіны, знакамітыя пісьменнікі, мастакі, кампазітары.

Аб чым пісала «Беларуская работніца і сялянка» ў першым нумары? Якім гераіням прысвячала свае публікацыі? Чым вызначаліся юбілейныя нумары? Давайце разам пагартаем старонкі выдання. *(Арфаграфію арыгіналаў захоўваем.)*

### 1924 год

У першым нумары рэдакцыя звярнулася да сваіх чытачак: «Рабоче-крестьянская власть, революцией рождённая, дала женщине равноправие. Женщина получила все гражданские и политические права; она может занимать в нашей Республике самые высокие посты. Революция разбудила в женщине жажду знаний. Вопросы общественной жизни волнуют тружениц города и деревни. Но тем не менее количество работниц и селянок, вовлечённых в строительство новой жизни, ничтожно; объясняется это тем, что все тяготы семьи: уход за детьми, стряпня, стирка и т. д. всей своей тяжестью ложатся на женщину...

Отдел по работе среди женщин ЦК КП(б)Б, учитывая жажду знаний у белорусской работницы и крестьянки и необходимость вовлечь её в строительство будущего нашей страны, приступил к изданию журнала «Белорусская работница и селянка». Цель журнала — проникнуть во все уголки нашей крестьянской ещё малограмотной Белоруссии, будить сознание трудящихся масс. Пусть не будет во всей Белоруссии ни одного уголка, где бы не было друзей журнала «Белорусская работница и селянка»!» У № 1 апублікаваны дасланы Н. К. Крупскай артыкул. Спецыяльна для першага нумара часопіса Янка Купала напісаў верш «Дзве сястры».

### 1946 год

У пасляваенны час на старонках «Работніцы і сялянкі» з'яўляецца вялікая колькасць публікацый пра подзвігі савецкіх воінаў, якія змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны, пра тых, хто зрабіў унёсак у Перамогу.

У нумары за 1946 год радавы В. Палікарпава расказвае пра сваю службу ў Чырвонай Арміі. Дзяўчына прайшла шлях ад Сталінграда да Берліна. «Аднойчы наляцела на нас вялікая група варожых самалётаў. Трэба было адбіць налёт. Вораг выявіў месцазнаходжанне нашага разліку і пачаў скідваць бомбы. Яны рваліся зусім блізка ад нас...» — і сёння гэтыя радкі аб перажытым немагчыма чытаць без хвалявання.

У тым далёкім годзе часопіс піша пра знакамітую народную артыстку БССР Ірыну Ждановіч. Падкрэсліваюцца ўласцівыя ёй рысы: глыбокае разуменне сутнасці кожнага вобраза, шчырае хваляванне за іх сцэнічны лёс, высокі прафесіяналізм і ўменне дакладна ўвасобіць сваіх герояў. Прыгадваюцца некаторыя з самых значных роляў актрысы: Данілка ў драме Янкі Купалы «Раскіданае гняздо», Джульета ў трагедыі В. Шэкспіра «Рамэа і Джульета», Вера ў п'есе М. Горкага «Апошнія», Марылька ў «Бацькаўшчыне» К. Чорнага і іншыя. Аўтар таксама апісвае Ірыну Ждановіч як выдатную гаспадыню, пяшчотную маці і рукадзельніцу.

### 1949 год

У 25-гадовы юбілей рэдакцыя часопіса «Работніца і сялянка» атрымала шматлікія віншаванні. Цёплыя словы адрасавалі выданню прадстаўнікі ўрада, вядомыя асобы, чытачы і сябры. Павіншаваў супрацоўнікаў і аўтараў часопіса народны паэт Беларусі Якуб Колас. «Жадаю вам здароўя, радасці, поспехаў у Вашай многагранней гераічнай дзейнасці, дарагія жанчыны!» — напісаў класік.

